**Афганістан** — боль і слава // Голас Сенненшчыны. — 2009. — 24 лют. — С. 3.

# АФГАНІСТАН – БОЛЬ І СЛАВА



Згодна са статыстычнымі данымі, сёння ў Беларусі жыве звыш 22 тысяч удзельнікаў афганскай вайны. Самым маладым з іх – па 39 гадоў. Яны з тых, хто 20 гадоў таму пакідаў чужую краіну. Тым, хто 21 снежня 1979 года першым увайшоў у Афганістан, куды больш.

Сярод сенненскіх афганцаў, што сабраліся ў раённым Доме культуры напярэдадні юбілейнай даты, былі людзі featuredнага ўзросту. Леанід Станкевіч і Уладзімір Грачоў нарадзіліся яшчэ да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, ваявалі ў Афганістане афіцэрамі. Большасць прысутных у зале трапілі ў ваеннае пекла адразу пасля заканчэння школы.

...Сяргей Акулёнак і Аляксандр Кучынскі вучыліся ў адным класе, сядзелі за адной партай. Аляксандр прызываўся на тэрміновую вайсковую службу Сенненскім райваенкаматам, Сяргей трапіў у армію з Ленінграда. Хлопцы перапісваліся, а аднойчы сустрэліся – на вайне. Іх бронетранспарцёры рухаліся ў складзе калон насустрач адзін аднаму, а яны ў разгубленасці не маглі вымавіць ні слова. Потым былі новыя сустрэчы, у тым ліку на афганскай вайне, а самыя шчаслівыя – дома. З іх класа, які выпускаўся з СШ № 1 г. Сянно ў 1985 годзе, дарогамі далёкай і чужой краіны прайшлі тры чалавекі. На шчасце, усе вярнуліся жывымі.



Афганская вайна для Віцебшчыны – асаблівая старонка гісторыі. Менавіта віцебскія дэсантнікі адначасова з вайсковымі спецпадраздзяленнямі першымі ўвайшлі ў Афганістан. На долю хлопцаў у блакітных берэтах выпаў штурм Кабула.



У канцы 1979 года жыхары Віцебска, што жылі ў раёне 5 палка, маглі назіраць такую карціну – малады салдат, які ўзлез на высокі плот, клікаў і прасіў: «Вазьміце пісьмо! Кіньце яго ў паштовую скрыню!» Яны ведалі, што чакае іх наперадзе, і спяшаліся паведаміць пра гэта родным.

Большасць сенненскіх афганцаў на вайну трапілі пазней. Але свой абавязак салдата яны выканалі. З вайны многія вярнуліся не толькі з ранамі, але і з узнагародамі. У РДК іх сабралі таксама, каб уручыць юбілейны медаль «20 гадоў вываду савецкіх войск з Афганістана». Іх афганцам уручалі старшыня Сенненскага райвыканкама Эдуард Герасіменка і ваенны камісар раёна Аляксандр Цемнікаў. У такой абстаноўцы было шмат успамінаў, расказаў пра тую вайну. Да гэтага часу яе вывучаюць у ваенных навучальных установах, па ёй напісаны падручнікі. А яшчэ яна засталася ў дакументах іншага кшталту – у фотаздымках, дакументальных фільмах, раманах і песнях, пранікнёных і чыстых – як чалавечая споведзь, як юнацкае прызнанне ў вернасці і любві. Былыя салдаты спявалі самі, слухалі іншых. Канцэрт прадоўжыўся выступленнем танцавальных і вакальных груп Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.

На здымках: узнагароды афганцам; песні ў выкананні былых удзельнікаў баявых дзеянняў; Сяргей Акулёнак і Аляксандр Кучынскі – сябры на ўсё жыццё.